Суднік Г.

# З КЛІНКОМ І КУЛЯМЁТАМ

**Варанцоў Аляксандр Нікіфаравіч нарадзіўся ў 1907 годзе ў вёсцы Пань-Буда Касцюковіцкага раёна. Закончыў пачатковую школу. Пряцаваў у калгасе. У Чырвоную Армію прызван у ліпепі 1941 года. Прайшоў баявы шлях ад Масквы да Эльбы.**

**Званне Героя Савецкага Саюза радавому А. Н. Варанцову прысвоена Указам Прызідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 31 мая 1945 года.**

На вайну Аляксандр Нікіфаравіч Варанцоў трапіў чалавекам сталым – трыццаці чатырох год. Спецыяльнасці ваеннай не меў. Як усялякі селянін, умеў абыходзіцца з канём. Таму, напэўна, і накіравалі яго ў кавалерыйскую часць кулямётчыкам. На тактычных занятках радавы Варанцоў старанна акопваўся, акуратна будаваў "гняздо" для свайго "максіма". Над ім жартавалі: вось, маўляў, ваяка, баіцца. Варанцоў не крыўдзіўся. Моцна сядзелі ў ім сялянскія звычкі: усё рабіць грунтоўна, дабротна. І таму выконваў ён усё з нейкай асаблівай стараннасцю. І акопваўся, і свайго "максіма" даглядаў. Была ў Варанцова яшчэ адна важная якасць – прыроджаная кемлівасць. Не раз выручала яна яго ў баях. І не толькі самога Варанцова, а ўсё падраздзяленне.

...Пад Сычоўкай на пазіцыі 59-га гвардзейскага кавалерыйскага палка немцы кінулі механізаванае падраздзяленне з пушкамі, кулямётамі, мінамётамі. Разгарнуць эскадроны ў такім становішчы цяжка. А ў першым страі кавалерыстам таксама ваяваць не з рукі. А тут пяхота фашысцкая ў атаку перайшла. Хто ведае, чым бы ўсё скончылася, калі б не Варанцоў. Дзе за ўзгорачак схаваецца, дзе за грудок – і выбраўся на зручнае для абстрэлу немцаў месца. Падпусціў фашыстаў бліжэй і ўдарыў з "максіма". Цяпер ужо немцы залеглі. І адразу ж кінуліся ўперад кавалерысты. Фашысты не вытрымалі ліхой атакі конніцы, пачалі разбягацца.

Вось так, яе падстаўляючы сябе пад шалёныя кулі, дзейнічаючы і ў наступленні, і ў абароне з кемлівасцю, і ішоў радавы Варанцоў франтавымі дарогамі. Прывялі яны яго восенню 1943 года на родную беларускую зямлю, Нібы падвоіліся сілы Варанцова.

У баі за Калінкавічы кулямётчык Варанцоў дапамог эскадрону выканаць баявую задачу. Мяняючы баявыя пазіцыі, выкарыстоўваючы кожны ўзгорачак зямлі, ён увесь час аказваўся ў выгадным становішчы. Нямала ён фрыцаў адправіў на той свет. Амаль без страт уварваўся эскадрон у населены пункт.

А вось што здарылася ў баі за горад Быдгошч, на беразе Віслы. Праціўніку ўдалося адрэзаць эскадрон ад палка. Цяжка стрымаць

кавалерыстам напор фашыстаў і прабіцца да сваіх немагчыма. Куды ні кінуцца – усюды сустракаюць кулямётныя чэргі: вуліцы наскрозь прастрэльваюцца. Нядоўга разважаў Варанцоў, разумеў: трэба дзейнічаць рашуча. Ён кінуўся да бліжэйшага дома, мігам дабраўся да пляцоўкі трэцяга паверха, выбіў акно, устанавіў на падаконніку кулямёт. Агледзеўся. Аказалася – удалы дом выбраў: вуглавы. Можна кантраляваць усе падходы да скрыжавання вуліц.

...Прыціскаючыся да сцен, ад аднаго ўкрыцця да другога, перабягае група немцаў. Хтосьці з нашых ударыў па іх з супрацьлеглага дома. Фашысты хутка схаваліся за рэкламнай тумбай. Варанцову яны бачны як на далоні. І ён даў некалькі чэргаў па спінах гітлераўцаў. Ні адзін не ўзняўся.

Так працягвалася некалькі разоў. Нарэшце, гітлераўцы "засеклі" Варанцова. Яны выкацілі на вуліцу гармату, некалькі разоў выстралілі па дому. Усё задрыжэла, захадзіла пад нагамі Варанцова. Пасыпалася цэгла, рухнула лесвіца. Пляцоўка, на якой стаяў Варанцоў, літаральна вісела на арматуры. Кулямётчыка кантузіла.

Ён апрытомнеў, калі больш дзесятка немцаў падбягала да пад'езда. Увайсці ў дом ніводнаму не ўдалося: іх скасіў кулямёт Варанцова. Шэсць атак адбіў мужны салдат, губляючы прытомнасць і зноў прыходзячы ў сябе.

Калі ў горад уварваліся нашы часці, салдаты знайшлі сцякаючага крывёю Варанцова побач са сваім яшчэ не астыўшым кулямётам...

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні яму высокага звання Героя Савецкага Саюза Аляксандр Нікіфаравіч прачытаў па шляху дамоў, на дваццаць другі дзень пасля вайны, калі вяртаўся са шпіталя.

**Суднік, Г. З клінком і кулямётам / Г. Суднік // Магілёўская праўда. — 1970. — 28 жніўня. — С. 4.**